УДК 947.6-021 121

## Фарміраванне ідэалогіі і ідэалагічных інстытутаў Расійскай імперыі ў XVIII ст. – пач. XIXст.

Багдановіч А. І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі пачалося ў гады праўлення Кацярыны II. Перыяд з 1772 па 1796 год можна разглядаць як кацярыненскую эпоху ў Беларусі. У эпоху Кацярыны II Расійкая імперыя знаходзілася ў заключнай стадыі свайго будаўніцтва. Пётр I пачаў будаўніцтва імперыі – Кацярына II яго завяршыла. Пры кіраўніках, якія правілі паміж гэтымі манархамі, Расійская імперыя ператварылася ў доўгабуд, дзе не клапаціліся аб завяршэнні будаўніцтва, а толькі раскрадалі будаўнічыя матэрыялы і абсталяванне.

У кацярыненскую эпоху закладваецца аснова фарміравання ідэалогіі Расійскага самадзяржаўя. Склаліся перадумовы для стварэння ідэалагічных інстытутаў Расійскага самадзяржаўя. У гэты час да ідэалагічнай работы ўжо былі прыстасваныя праваслаўная царква, дзяржаўная сістэма адукацыі і перыядычны друк. Аднак на далучаных да Расіі беларускіх землях ідэалагічныя інстытуты расійскага самаўладдзя дзейнічалі абмежавана. Фактычна адбылося адноснае ўзмацненне пазіцый каталікай царквы і польскага ідэйнага ўплыву на падрастаючае пакаленне. Гэты ўплыў ажыццяўляўся праз сістэму навучальных устаноў, створанаую тут каталіцкімі і грэка-каталіцкімі манаскімі ордэнамі, а таксама езуіцкімі місіямі. Царскі ўрад не адразу ацаніў магчымасці ідэалагічнай прапаганды ў справе ўмацавання свайго высокага статусу на далучаных землях. Па-першае, гэта адбылося з-за недаацэнкі магчымасцей праваслаўнай царквы і сістэмы адукацыі, як ідэалагічных інстытутаў і, па-другое, баязню выклікаць незадавальненне і ўзброенае супраціўленне шматлікай мясцовай спольшчанай шляхты.

УДК 378.096 (476-25) (091)

## Ярашэвіч М.К. – першы рэктар БНТУ

Арбузаў А.Ц.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Міканор Казіміравіч Ярашэвіч нарадзіўся 11 ліпеня 1885 г. у мястэчку Новы Свержань Мінскага района. У 1910 годзе скончыў Глухаўскі